# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 22 мая 1997 года, чацвер, № 8(1763)


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


Тым, хто цікавіцца новымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі, прапануем працягнуць знаёмства з Інтэрнэтам

Стар. 2

Штогод у нашай краіне адзначаецца трагічная дата Чарнобыльскай катастрофы. Але мы ўзгадваем пра яе не толькі раз на год...

Стар. 3

Ва універсітэце праходзіць футбольны чэмпіянат. Хто зараз у фаварытах сезону? Артыкул на гэтую тэму прапануе наш пастаянны аўтар

Рэпартаж з агульнауніверсітэцкага студэнцкага фестывалю бардаўскай песні, які адбыўся на філалагічным факультэце

Стар. 4


## БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ ТЭЛЕТАЙП

Учора Сёння Заўтра

Стыпендыяткай Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі стала старшыня праф-бюро IV курса факультэта журналістыкі Віялета Сілакова. Стыпендыямі прафкама студэнтаў БДУ адзначаныя Вольга Іванова (прафгрупорг II курса факультэта журналістыкі), Аляксандр Шкаруба (праформ II курса геаграфічнага факультэта), Павел Зянькевіч (член прафбюро факультэта радыёфізікі і электронікі, студэнт IV курса), Сяргей Цімохін (старшыня прафбюро факультэта радыёфізікі і электронікі, студэнт IV курса), Аляксей Багамазаў (старшыня прафбюро геаграфічнага факультэта, студэнт IV курса).

## Прывітанне, Вязынка!

*Студэнцкі саюз Белдзяржуніверсітэта інфармуе:*

*24-25 мая ў Вязынцы адбудзецца традыцыйны студэнцкі фестываль "Белдзяржуніверсітэт — 97".*

*У праграме плануюцца конкурс паходнай кухні, міні-футбол, перацягванне каната, гіра, спартыўнае арыентаванне, армрэслінг, конкурс візітовак факультэтаў, прэс-канферэнцыя з адміністрацыяй БДУ, аукцыён, дыскатэка да світанку.*

Дзень адкрытых дзвярэй прайшоў у нашым універсітэце 15 мая. Абітурыенты сустрэліся з кіраўніцтвам універсітэта і дэканамі факультэтаў, азнаёміліся з правіламі прёму ў БДУ на 1997 год, наведалі вучэбныя аўдыторыі і лабараторыі.

• • •

Канферэнцыя працоўнага калектыву Белдзяржуніверсітэта прайшла 16 мая. Размова ішла пра выкананне калектыўнага дагавора за 1996 год, а таксама абмяркоўваліся дапаўненні і змяненні ў дагавор на 1997 год.

• • •

З 20 па 22 мая ва універсітэце праходзіла III Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў Беларусі, арганізаваная Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Беларускім каардынацыйным цэнтрам навукова-даследчай работы студэнтаў.

• • •

24 красавіка ў інтэрнаце № 7 Белдзяржуніверсітэта адбыўся фестываль студэнцкай песні. "Студэнцкая вясна — 97". У фестывалі прымалі ўдзел студэнты сёмага інтэрната, а таксама студэнты іншых інтэрнатаў БДУ. Арганізатарам фестывалю выступіў студэнцкі савет інтэрната пры непасрэднай падтрымцы выхавацеля інтэрната А.У.Канчэўскай.

**МОСКОВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. М.В. Ломоносова**

119899, Москва, В-234, Ленинские горы
Телетайп: 112863, ДЮЗА
Телекс: 411483 MGU SU
Телефакс: 939 01 26
Телефон: 939 36 10

№ 38/01-27
от 08.04.97.
на №

*Студенческому Союзу Белорусского государственного университета*

*Ректорат и Студенческий Союз Московского государственного университета им. М.В. Ломоносова искренне поздравляют студентов Белорусского государственного университета с созданием молодежной организации — Студенческого Союза.*

*Мы уверены, что новая организация станет мощной силой студенческого самоуправления и сделает все возможное для реализации творческого потенциала, талантов и способностей студентов, а также продолжит контакты молодежных структур Московского и Белорусского государственных университетов.*

*Желаем успехов в работе и больших достижений.*

*Ректор Московского университета, член-корреспондент РАН* — *В.А. Садовничий*

*Президент Студенческого Союза Московского университета* — *Ю.П. Зинченко*

"8" апреля 1997г.



24 красавіка ў галоўным копусе універсітэта адбыўся выбарчы сход Студэнцкага саюза БДУ. Ад адміністрацыі універсітэта на сходзе прысутнічалі прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях А.У.Паўлаў, начальнік кіраўніцтва перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы С.А.Чайкун, начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю А.Багдановіч.

Дэлегатамі і гасцямі сходу былі заслуханы выступленні прадстаўнікоў адміністрацыі універсітэта і лідэраў ініцыятыўных груп з факультэтаў. Актыўна абмяркоўваліся пытанні па станаўленню і будучай дзейнасці новай маладзёжнай арганізацыі БДУ. У выніку адкрытага галасавання быў выбраны камітэт Студэнцкага саюза БДУ, куды ўвайшлі прадстаўнікі ад ініцыятыўных груп факультэтаў, а таксама члены аргкамітэта па стварэнню Студсаюза БДУ. Старшынёй камітэта Студэнцкага саюза аднагалосна быў прызначаны студэнт мехмата Сяргей Дзіесператў. Прарэктар А.У.Паўлаў пажадаў Студсаюзу поспехаў у рабоце і заверыў усіх прысутных ва ўсебаковай падтрымцы маладой універсітэцкай арганізацыі.

Больш падрабязна пра новую студэнцкую арганізацыю чытайце ў наступных нумарах "БУ".

## "Шматдакладныя" студэнты — падмурак навукі

Штогод увесну на факультэтах БДУ праходзіць навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў. Яе правядзенне пачынаецца пленарным пасяджэннем: акрэсліваецца мэта канферэнцыі, пералічваюцца секцыі, зачытваюцца найбольш цікавыя даклады. А пазней студэнты, замучаныя напружанай працай (звычайна усё дапісваецца напярэдадні), разыходзяцца па секцыях, каб апошнім намаганнем волі "выплюхнуць" свае перлы на таварышаў і нарэшце адпачыць.

Гэты год не стаў выключэннем. Увесь красавік дакладчыкі жылі "ў прадчуванні": не елі, не пілі, на дыскатэкі не хадзілі (адносна, канешне). І думалі толькі аб тым шчаслівым імгненні, калі, акрыленыя сваімі неардынарнымі здольнасцямі і ашаламляльным поспехам, захваленыя навуковымі кіраўнікамі, яны прыйдуць дадому і будуць доўга-доўга-доўга спаць.

І вось канферэнцыя скончылася, этап хвалявання — пройдзены і забыты...

Са здзіўленнем для сябе я заўважыла, што ў праграме канферэнцыі сустракаюцца імёны людзей, якія чыталі даклады адразу на чатырох секцыях. Стымулам не маглі быць грошы: сродкі на прэміі выдзяляліся, але не вялікія.

Немалая колькасць студэнтаў, адчуваючы няўпэўненасць у будучай сесіі, удзельнічае ў канферэнцыі з мэтай паспрыяць лягчэйшай здачы экзаменаў. Аднак наўрад ці па некалькі дакладаў пішуць менавіта яны...

Найбольш верагодна, што "шматдакладныя" студэнты рыхтуюць падмурак для вялікіх справаў у будучыні — аспірантура на гэтым этапе разглядаецца станоўча з усіх бакоў (акрамя матэрыяльнага).

Думаю, што калі імпэт і захапленне дакладамі ў студэнтаў не знікнуць, а крыніца энергіі не перасохне, то кожны раз з надыходам навукова-практычнай канферэнцыі будуць нараджацца новыя таленты, што само па сабе паспрыяе развіццю навукі.

*Валерыя АЎСЯНІК*

## Падпіска -97

15 чэрвеня завяршаецца падпіска на газеты і часопісы на другое паўгоддзе 1997 года. Да гэтага часу можна яшчэ паспець падпісацца на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта", які ў Каталогу рэспубліканскіх падпісных выданняў знайсці няцяжка: сярод тоесных выданняў ён адзін з самых танных.

Падпісная цана па серыях такая:

Серыя III (інд. 74853) — гісторыя, філасофія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад) — 36000 рублёў;

Серыя IV (інд. 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (№ 2, жнівень; № 3, снежань) — 36000 рублёў;

Серыя I (інд. 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень) — 18000 рублёў;

Серыя II (інд. 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік) — 18000 рублёў.

Падпіска на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

У рознічны продаж часопіс не паступае.

## Увага!

***Механіка-матэматычны факультэт праводзіць традыцыйнае свята "Дні ММФ — 97", якое адбудзецца 31 мая.***

***У праграме свята:***

— урачыстае выступленне дэкана ММФ;
— грандыёзнае шэсце вакол галоўнага корпуса БДУ;
— мноства цікавых атракцыёнаў (ЗАГС, казіно, выязное фота і інш.);
— пастаянная работа буфета;
— прэс-канферэнцыя з удзелам выкладчыкаў і выпускнікоў;
— выступленне каманды КВЗ ММФ;
— мноства іншага.

*Вечарам адбудзецца дыскатэка. Будзьце ўпэўнены, што добры настрой не пакіне вас у гэты апошні дзень вясны.*

*Прыходзьце! Не пашкадуеце...*

*Да сустрэчы 31 мая.*

Аргкмітэт "Дні ММФ — 97"




*Мал. 1*

*Мы працягваем знаёміць нашых чытачоў з камп'ютэрнай сеткай Інтэрнэт і прапануем наступны артыкул з серыі матэрыялаў, прысвечаных тым, хто збіраецца працаваць у гэтай галіне.*

## *IV. Браўзар Netscape Navigator. Падрыхтоўка да працы*

# Што такое Інтэрнэт

*13. Што такое браўзар (англ.: browser)?*

Для таго, каб збіраць інфармацыю ў WWW, вы павінны мець на сваім камп'ютэры спецыяльнае праграмнае забеспячэнне — **браўзар** (націск на першым складзе). Цяпер вядома каля трыццаці браўзараў; найбольш распаўсюджаныя з іх — гэта Netscape Navigator, Mosaic і Microsoft Internet Explorer. Мы ў БДУ працуем з Netscape Navigator, які пакуль што займае першы радок у сусветным табелі аб рангах (яго доля на рынку складае 70%).

Браўзары трох пакаленняў фірмы (асноўныя версіі — Netscape Navigator, Netscape Navigator 2.0, Netscape Navigator 3.0 "Atlas"), безумоўна, паміж сабою адрозніваюцца па сваіх функцыянальных магчымасцях, але ў іхнай структуры захоўваецца пераемнасць. Далейшы разгляд будзе датычыцца стандартных элементаў усіх версіяў; у неабходных выпадках мы будзем спыняць увагу на асаблівасцях канкрэтнай мадыфікацыі.

*14. Як выглядае і з якіх частак складаецца галоўнае акно браўзара Netscape Navigator ?*

Пасля таго, як вы дасце камп'ютэру каманду пачаць працу з праграмай Netscape Navigator (напрыклад, падвойным шчаўчком па адпаведнай іконцы ў стартавай групе), на экране зўявіцца галоўнае акно браўзара. **Верхняя частка акна** паказаная на малюнку 1.

Браўзар Netscape Navigator прызначаны для працы ў аперацыйных сістэмах Windows, таму ў структуры яго акна вы ўбачыце не толькі спецыфічныя дэталі, але і вядомыя вам элементы (загаловак, меню, кнопкі і г.д.).

1. **Загаловак акна.** Месца для размяшчэння аўтарскай назвы таго дакумента, які вы атрымаеце з WWW.

2. **Лінейка меню.** Па зместу яна амаль супадае са стандартнай лінейкай меню Windows. З асобнымі пунктамі меню мы пры неабходнасці будзем знаёміцца падчас далейшай працы. Дарэчы, напамінаем, што кожны пункт меню, калі па ім шчоўкнуць левай клавішай мышкі, раскрываецца ў спіс камандаў.

3. **Лінейка інструментальных кнопак.** Як прынята ў сістэме Windows, гэтыя кнопкі функцыянальна дублююць частку камандаў з галоў-

Звярніце ўвагу, што надпісы на многіх кнопках як бы сцёртыя — гэта азначае, што ў зыходным стане (адразу пасля загрузкі праграмы) такія кнопкі і адпаведныя каманды — неактыўныя.

4. **Адраснае поле.** У гэтым полі мы будзем запісваць URL патрэбнага дакумента; тут жа мы ўбачым і URL тых старонак, на якіх апынемся, рухаючыся па сістэме гіперсувязяў. Назва поля будзе змяняцца на розных стадыях працы: Go to — пры запісе адраса, Location — пры атрыманні дакумента, Netsite — пры кантакце з сэрверам фірмы Netscape.

5. **Лінейка кнопак даведніка.** З іх дапамогай мы зможам закантактаваць з тымі дакументамі і месцамі ў Інтэрнэце, якія рэкамендуе нам фірма Netscape.

6. **Індыкатар стану.** Гэты касмічны малюнак з'яўляецца лагатыпам фірмы Netscape. У асноўным стане ён статычны, але ў час, калі ваш камп'ютэр усталёўвае сувязь з аддаленым сэрверам ці прымае інфармацыю, у акенцы індыкатара круцяцца Зямля і зоркі.

**Сярэдняя частка акна** адразу пасля загрузкі браўзара пустая. Яна прызначаецца для размяшчэння той інфармацыі, якую вы будзеце атрымліваць з Інтэрнэту.

**У ніжняй частцы акна** таксама амаль нічога няма, але мы ўжо цяпер азнаёмімся з тым, што там зможам убачыць у працэсе работы (гл. малюнак 2).




*Мал. 2*

7. **Індыкатар канфідэнцыяльнасці.** Малюнак у выглядзе зламанага ключа азначае, што ідзе прыём ці перадача неканфідэнцыяльных звестак.

8. **Поле паведамленняў.** Падчас сеансу сувязі тут размяшчаюцца тэкставыя паведамленні аб стане пераносу інфармацыі. Калі дакумент атрыманы, у гэтым полі запісваюцца адрасы тых старонак, да якіх накіраваныя гіперсувязі.

9. **Індыкатар выканання.** У графічнай форме паказвае долю перанесенай у гэты момант інфармацыі.

10. **Электронная пошта.** Гэтую праграму цяпер разглядаць не будзем.

*15. Як наладзіць браўзар на максімальна магчымую хуткасць прыёму інфармацыі ?*

Асноўны фактар, які вызначае малую хуткасць працы ў Інтэрнэце — гэта нізкая прапускная здольнасць нашых тэлекамунікацыйных каналаў. Акрамя таго, вы сутыкнецеся і з загружанасцю папулярных сэрвераў. У такіх умовах праблема эфектыўнасці прыёму інфармацыі аказваецца асабліва актуальнай.

Web-дакумент звычайна складаецца з двух кампанентаў: тэкставага і графічнага, прычым менавіта малюнкі патрабуюць многа месца ў памяці камп'ютэра. Калі ўлічыць, што сэнсавая насычанасць характэрная ў асноўным для тэкста, то нам мэтазгодна прытрымлівацца наступнага алгарытму працы: спачатку будзем выклікаць тэкставую частку Web-старонкі, а потым, пры неабходнасці, зноў будзем звяртацца да таго ж сэрвера па адпаведныя графічныя фрагменты.

Зоймемся падрыхтоўкай браўзара да выканання вышэйназванага алгарытма.

*(Увага! Далейшыя аперацыі патрабуюць пільнасці. Памятайце: адзін недасведчаны чалавек можа так сапсаваць канфігурацыю праграмы, што задасць работы дзесяці спецыялістам. Калі дзе-небудзь памыліцеся — адразу спыняйцеся і націскайце кнопку Cancel альбо клавішу Esc.)*

а) Устанаўленне рэжыму прыярытэту для тэкставай часткі дакументаў.

Адкрыйце пункт меню Options, потым падпункт Preferences... (варыянт: General Preferences у браўзары Netscape Navigatior 2.0) і з картатэкі дастаньце (шчоўкніце па назве) картку Images. Знайдзіце поле Display Images з уключальнікамі рэжымаў While Loading і After Loading. Уключаным (чорная кропка ў белым кружку) павінен быць рэжым After Loading.




*Мал. 3*

Калі ў белым кружку побач са словамі After Loading няма чорной кропкі, шчоўкніце па гэтаму ўключальніку. Змену рэжыму зафіксуйце, націснуўшы кнопку OK у ніжняй частцы карткі. Калі ж вы нічога не змянялі ў канфігурацыі ці памыліліся — націсніце кнопку Cancel.

Аптымальная канфігурацыя пункту Images меню Options/Preferences павінна быць такой, як паказана на малюнку 3 (браўзар Netscape Navigator 2.0).

б) Устанаўленне рэжыму ручной загрузкі графічных фрагментаў.

Яшчэ раз адкрыйце меню Options і праверце, каб не было галачкі ў радку Auto Load Images. Калі галачка ёсць — змяніце рэжым, для чаго шчоўкніце па гэтаму радку; калі галачкі няма (патрэбны нам стан) — шчоўкніце дзе-небудзь за межамі меню, каб спыніць аперацыю.

Аптымальная канфігурацыя пункту Options галоўнага меню у нас будзе такой, як паказана на малюнку 4 (браўзар Netscape Navigator 2.0).




*Мал. 4*

Калі вы не памыліцеся, выконваючы пункт б, то ўбачыце, што кнопка Images (лінейка інструментальных кнопак) знаходзіцца ў актыўным стане (літары і графічныя элементы выразна чытаюцца на яе паверхні).

Змест абсалютнай большасці Web-старонак на сэрверы абнаўляецца не так ужо і часта. Будзем лічыць, што за перыяд сеансу сувязі дакумент не змяняецца, і выканаем яшчэ адну аперацыю, якая дазволіць паскорыць працу.

в) Адмова ад праверкі зменаў у дакументах

Адкрыйце пункт меню Options, потым падпункт Preferences... (варыянт: Network Preferences у браўзары Netscape Navigator 2.0) і з картатэкі дастаньце (шчоўкніце па назве) картку Cache. Знайдзіце поле Verify Documents з уключальнікамі Once Per Session, Every Time і Never. Уключаным (чорная кропка ў белым кружку) павінен быць рэжым Never.




*Мал. 5*

Калі ў белым кружку побач са словам Never няма чорнай кропкі, шчоўкніце па гэтаму ўключальніку. Змену рэжыму зафіксуйце, націснуўшы кнопку OK у ніжняй частцы карткі. Калі ж вы нічога не змянялі ў канфігурацыі ці памыліліся — націсніце кнопку Cancel.

Выніковая канфігурацыя пункту Cache меню Options/Preferences паказана на малюнку 5 (браўзар Netscape Navigator 2.0).

Спецыялісты знойдуць яшчэ і іншыя магчымасці палепшыць канфігурацыю браўзара, але мы з вамі на гэтым спынімся. У наступнай частцы публікацыі будзе абмяркоўвацца методыка прыёму інфармацыі.

*А.РАГОЙША*

*Сорасаўскі вучэбна-інфармацыйны цэнтр па хімічнай адукацыі*

*Кафедра агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі*

# ЧЭМПІЯНАТ НА КАСТРЫЧНІЦКАЙ

Не паспелі нашы футбалісты ўдосталь накрычацца на трыбунах мінскіх стадыёнаў на матчах чвэрцьфіналу кубка і чэмпіянатаў краіны, а ў дзверы грукае свой чэмпіянат. Распачалі яго 12 мая ў 15.30 каманды фізікаў і географаў. Трэба адзначыць, што выйсці на поле універсітэцкія дружыны павінны былі на месяц раней. Гавораць, што ў прыроды няма дрэннага надвор'я, але арганізатары вырашылі не марозіць хлопцаў.

Упершыню універсітэцкі чэмпіянат прымае спорткомплекс па вуліцы Кастрычніцкай. Вельмі радуе, што футбалістам і балельшчыкам не трэба цягнуцца ў Шчомысліцу.

## Расклад астатніх гульняў:

Група А
22.05
Фізічны — журналістыкі (15.30)
Міжнародных адносін — геаграфічны (16.30)
Радыёфізікі і электронікі — хімічны (17.30)

Група Б
23.05
*ФЭФ — гістарычны (15.30)*
*ФПМІ — механіка-матэматычны (16.30)*
*Юрыдычны — філалагічны (17.30)*

Зацятыя прыхільнікі футбола маглі заўважыць, што склад груп змяніўся ў параўнанні з тым, які быў да 14 красавіка. Тады група А атрымалася недазволена моцнай. Улічваючы правілы, паводле якіх каманды, якія занялі 1-е і 2-е месца ў мінулым годзе, павінны быць разведзеныя па розных групах, адна з каманд-удзельніц падала пратэст.

Каманды згуляюць у групах паміж сабою. Дзве лепшыя з кожнай групы выйдуць у фінальную частку спаборніцтва, дзе будуць гуляць таксама па кругавой сістэме, але ўжо з улікам гульняў, якія яны правялі паміж сабой у групах.

Зараз цяжка гаварыць пра фаварытаў. Першымі могуць быць некалькі факультэтаў, але ніхто не дасць гарантыі, што хтосьці не паднясе сюрпрыз, як гэта зрабілі ў мінулым годзе радыёфізікі, стаўшы пераможцамі. Няхай юрысты і страцілі свайго дыспетчара Шалву Гегелію, але год таму гэта была самая зладжаная каманда універсітэта з вельмі тэхнічнымі, думаючымі футбалістамі. Павел Лутовіч, Саша Сямашка, Сяргей Ільіч, Вова Матусевіч, Віталь Цімафеевіч, дый усе астатнія хлопцы зробяць усё магчымае, каб увайсці на першую прыступку, а не застацца ў адным мячы ад яе, як было два гады запар.

Даволі моцная і каманда геафака. Праўда, яна засталася без некалькіх студэнтаў, што летась былі на пятым курсе, але ў яе саставе — адзін з лепшых футбалістаў універсітэта Дзмітрый Кадакоў, "кат" юрыстаў Ягор Канончык (менавіта пасля яго гола юрфак стаў толькі другім), адзін з мацнейшых варатароў Віктар Толкач.

Ні ў якім разе не трэба забываць і пра мінулагодняе чацвёртае месца. Каманда мехмата — даволі ганарыстая і, як ужо даказала практыка, здольная на многае. Тут шмат што будзе залежаць ад таго, у якой форме прыйдзе да гульняў трэці футбаліст мінулага чэмпіяната і лідэр мехмата Міхаіл Лукашэвіч.

Павінен сказаць сваё слова і ФЭФ. Каманда дапоўнілася даволі моцнымі першакурснікамі. Шмат турботаў у абаронцаў сапернікаў будзе са звязкай Лаўроў-Пеннікаў.

Ёсць яшчэ адна "цёмная кабылка" — факультэт міжнародных адносін. Ад гэтай каманды невядома чаго варта чакаць. З аднаго боку, міжнароднікі ўпершыню з'явіліся на чэмпіянат, і можна меркаваць, што каманда будзе толькі разгульвацца, каб ужо на наступны год заявіць пра сябе на поўны голас. Але... Там знаёмыя ўсё твары. Бо юрысты-міжнароднікі гулялі за юрфак, гісторыкі-міжнароднікі — за проста гісторыкаў... У кампаніі з яшчэ не абстралянымі, але таленавітымі першакурснікамі Дзімам Карабачом, Андрэем Вараб'ёвым, Яўгенам Лепцевым будзе гуляць дасведчаны Шалва Гегелія, лепшы футбаліст мінулага чэмпіянату.

"Мяч круглы — поле прастакутнае", — любяць казаць футбалісты. Ніхто не ведае, што будзе з турнірнай пазіцыяй любой каманды. Але няма сумненняў, што нас чакаюць вельмі цікавыя гульні.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*



# Спявалі барды

23-24 красавіка ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ прайшоў студэнцкі фестываль бардаўскай песні. Прызнацца шчыра, жыццё студэнтаў БДУ не надта перанасычанае культурна-масавымі мерапрыемствамі агульнауніверсітэцкага маштабу. Тым больш дзіўна, што падчас выступлення канкурсантаў глядацкая зала была напалову пустая. І дарма — бо паглядзець і паслухаць у гэтыя два вечары было што.

Першы дзень быў конкурсны. Трынаццаць удзельнікаў, што паспяхова прайшлі адборачны тур, выносілі на суд гледачоў і журы па дзве песні. Старшынёй паважанай арбітражнай камісіі з'яўляўся вядомы на Беларусі музыкант, ідэйны натхняльнік гурту "Камэлот" Ігар Войніч.




Па выніках конкурсу ітогавыя месцы сярод удзельнікаў фестывалю размеркаваліся наступным чынам: лаўрэатамі сталі студэнты філфака Андрэй Скурко (першы прыз) і Уладзімір Ярмак (другі прыз), а таксама прадстаўнік гістарычнага факультэта Андрэй Масцераў (трэці прыз). Наяўнасць у першай тройцы двух артыстаў з філфака не вынік нейкай заангажаванасці журы, трое з членаў якога выкладаюць філалагічныя дысцыпліны, а хутчэй заканамернасць. Па-першае, не сакрэт, што 99% мужчынскай паловы філфака займаюцца літаратурнай творчасцю. А па-другое, і Андрэй Скурко, і Валодзя Ярмак таленавіта, як кажуць, з душой "падалі" сябе. І таму пры вызначэнні пераможцаў ні ў гледачоў, ні ў членаў журы сумненняў не ўзнікла. Дарэчы, спецыяльны прыз за лепшы тэкст атрымаў таксама ўдзельнік ад філалагічнага факультэта — Віктар Казюлін.

Увогуле, узровень фэсту быў даволі высокім. І на другі дзень, калі праходзіў гала-канцэрт, многіх канкурсантаў гледачы сустракалі шквалам воплескаў. Запомніліся выступленні Максіма Таранава (факультэт міжнародных адносінаў), Сяргея Пузікава (геаграфічны факультэт), Георгія Тучкоўскага (выкладчык хімфака), Аляксея Нежаўца (мехмат), Уладзіміра Смаляка (прыз за самую арыгінальную музыку, філфак), Юліі Траякуравай (прыз "Разенбаўм у спадніцы", філфак), Міколы Адама.

Хацелася б выказаць шчырую падзяку рэктарату, аддзелу выхаваўчай работы з моладдзю, Студэнцкаму саюзу БДУ, актывістам Студэнцкага саюза БДУ на філфаку, студэнтцы фізфака Наталлі Драздовай за дапамогу ў правядзенні і арганізацыі фестывалю. Будзем спадзявацца, што гэтае свята паэзіі і музыкі стане традыцыйным.

*Ніл ЮЗАК,*
*студэнт 4-га курса філфака*



# Некалькі парадаў на выжыванне студэнтам, якія вылецелі з-пад бацькоўскага крыла

Яшчэ год таму я пасмейвалася над расповядамі сваёй сяброўкі — студэнткі адной сталічнай ВНУ — пра тое, як ёй даводзіцца жыць на адну стыпендыю, далёка ад бацькоў. Дурніца! Ды кожная выпускніца марыла трапіць вучыцца ў сталіцу. Далей ад мамы з татам, на поўную свабоду.

Мая мара збылася. Спярша былі радасць, шчасце. "Хараство" пачалося потым, калі я пасялілася ў інтэрнаце. Мае бацькі, у сілу больш чым сціплых фінансавых магчымасцяў, дапамагаць не маглі. Пра гэта я забыла, як толькі атрымала свае першыя кроўна зробленыя грошы. Яны разышліся так хутка, што я і зразумець не паспела: куды? Дзень памаялася так-сяк, на другі дакладна зразумела — адна, мамы побач няма, і яе кашы няма, і баршчу няма... А да стыпендыі — месяц. З самастойнасцю цябе!

Цяпер ужо, праз год, я навучылася ўсім прыёмам, мажлівым і немажлівым, чым і хачу падзяліцца з тымі, хто ўваходзіць у нашую студэнцкую "інтэрнатаўскую" сям'ю.

**Парада першая. Безнадзейная.** Казаць студэнту ў дзень стыпендыі: трэба эканоміць, думай пра заўтрашні дзень — усё адно, што пляваць у столь. Студэнцкія пірушкі — справа традыцыйная, векавая і таму недатыкальная. Нехта, канешне, можа сабе дазволіць схадзіць у тэатр або "адшпіліць" палову стыпендыі на канцэрт заезджай поп-зоркі. Але я вам скажу, што найлепшы і самы эканомны спосаб бавіць час — у вузкім коле. Тут табе і буфет (калі кожны прыцягне нешта са сваіх запасаў, стол атрымліваецца салідны і разнастайны), і канцэрт (магнітафон, гітара), жарты, смех.

**Парада другая. Практычная.** Пазычаць грошы нядобра. Не таму, што нядобра ў прынцыпе, а таму, што іх трэба ж аддаваць. Лепей пазычаць натурай — прадуктамі. У чым тут хітрасць? А хто, скажыце, потым у вас запатрабуе вярнуць пару бульбінаў, жменю крупаў ці кавалак хлеба з маслам? На маёй практыцы такога не было. Але варта памятаць: закон узаемавыручкі і дагэтуль свята захоўваецца студэнтамі. Сёння ты, заўтра табе.

**Парада трэцяя. Транспартная.** Транспартныя расходы ў студэнцкім бюджэце дзірку робяць вялікую. І паколькі затраты на паездкі дадому ўсё-такі акупляюцца бацькоўскімі харчамі, даводзіцца эканоміць на гарадскім транспарце.

Студэнту, дарэчы, там зараз вельмі ўтульна: сярод масы беспрацоўных і маламаёмасных "зайцоў" яму згубіцца няцяжка. Але душа просіць творчасці. Вось і з'яўляюцца на свет адпрасаваныя талончыкі (няхай даруюць нам кантралёры!). А шчырая, празрыстая сляза і расказ пра цяжкое жыццё, які не кранае хіба што камень, ды яшчэ шырока дэманстраваны пусты да непрыстойнасці кашалёк... Спектакль, дый годзе. Міжволі думаеш: а ці тую спецыяльнасць ты абраў? Можа, у тэатральны падацца?

**Парада чацвёртая. "Анучная".** Апранулся хочацца модна і прыгожа. Вельмі хочацца. Толькі магчымасці амаль ніколі няма.

Мая парада простая і старая: наведайце бабулю або цётку, выпатрашыце куфры — і цягніце ўсё, што знойдзеце, у інтэрнат. Там пад наглядам і па падказках дасведчаных швачак і дамарослых мадэльераў можна змайстраваць сабе вельмі нават прыстойны гардэробчык.

Дарэчы, настойліва рэкамендую навучыцца шыць-краіць. Шмат хто з дзяўчат не толькі сябе абслугоўвае, але і бярэ заказы "з боку". Прыстойна, між іншым, зарабляюць.




**Парада пятая. Навукова-метадычная.** Побыт побытам, а пра галоўнае студэнт ніяк забываць не павінен. Пра навучанне. Выкладчыкі, прачытаўшы чарговую лекцыю, "сватаюць" нам тую ці іншую навучальную літаратуру, наіўна думаючы, што мы адразу ж кінемся па кнігарнях — на апошнія грошы пашыраць свае "інтэрнатаўскія" бібліятэкі. Марна спадзяюцца. На такі подзвіг здольныя або вельмі даравітыя, або звар'яцелыя. Большасць абыходзіцца мінімумам, толькі зрэдку раскашэльваючыся на асабліва каштоўныя кнігі. Як чалавек дасведчаны, рэкамендую звярнуцца да суседа ці суседкі са старэйшага курса і папрасіць "аформіць спадчыну" на падручнікі, канспекты, курсавыя і г.д.

**Парада шостая. Аптымістычная.** Не палохайцеся цяжкасцяў! Ні гэтых, ні якіх-небудзь іншых. Студэнцкае жыццё — асаблівае, не падобнае ні да якога іншага. І хто зведаў яго — той быў шчаслівым. А праблемы, цяжкасці — неадменны яго атрыбут. І яшчэ — аб'ект студэнцкіх жартаў. Тым і адрозніваемся мы ад іншых "маламаёмасных" слаёў насельніцтва.

*Інна НІКІЦЕНКА*
*(друкуецца са скарачэннямі паводле "Знамя юности")*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00.*

*22 МАЯ*
*Зак. 1792*
*Т. 1000 экз.*
*Бясплатна*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.*

В.а. рэдактара Т.М. КАЗАК

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*